УДК 82-1

# МАТЫВЫ ТРАГІЗМУ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА І СЯРГЕЯ ЯСЕНІНА

**Бароўская Ірына Анатольеўна**
Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (г. Гомель, Беларусь)

*У артыкуле аналізуецца творчасць Максіма Багдановіча і Сяргея Ясеніна, праводзяцца паралелі асноўнай праблематыкі твораў, падобныя матывы тугі, смутку, безнадзейнасці жыцця, агульныя матывы трагізму ў іх творчасці.*

У гісторыі беларускай літаратуры постаць славутага Максіма Багдановіча заўсёды будзе выступаць сімвалам нашай радзімы. Яго асоба, нібы камета: нарадзілася, хутка праляцела на нашай зямлі, пакінула за сабой яскравы след на небасхіле Сусвету і працягвае кранаць нашы душы. І кожны раз, калі глядзіш на зорнае неба, усплываюць радкі паэта “*зорка Венера ўзышла над зямлёю*”…

У 1913 годзе ў беларускай літаратуры з’яўляецца яго “Апокрыф”. Напісаны мастацкай прозай, падобны да яго вершаў, твор выказвае думкі аўтара аб высокім значэнні паэзіі і прысвечаны тэматычна і стылістычна тэме мастацтва. Як славуты Францыск Скарына ўвёў прадмовы і пасляслоўі да “Біблії”, так і М. Багдановіч паспрабаваў стылізаваць тагачасную мову пад прытчавую форму. Да прытчаў у сваіх знакамітых словах-казаннях нярэдка звяртаўся ў свой час Кірыла Тураўскі, на аснове адной з іх напісаў камедыю “Прытча пра блуднага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сына” Сімяон Полацкі. Своеасаблівымі прытчамі лічацца многія творы Якуба Коласа з цыкла “Казкі жыцця”.

*Калі скончылася сем тысяч год ад стварэння свету, Хрыстос зноў зышоў на зямлю і хадзіў па ёй, каб споўнілася тое, аб чым казалі прарокі* [1, с. 50].

“Апокрыф” незвычайна цікавы зместам, формай, таму што, імітуючы біблейскі стыль падачы, апавядае пра хаджэнне Хрыста з Апосталамі Пётрам і Юр’ем па *ўсім Забраным Краі і па Занёманшчыне, і па Задзвіншчыне, і па Бярэзінскай зямлі*. Гэтым творам Багдановіч раскрывае праблемы “ўзаемаадносін мастацтва і жыцця, месца ў жыцці мастацтва і мастака, мастацтва як адзінства эстэтычнага і этычнага” [2, с. 334].

Але шырокаму колу чытача М. Багдановіч найбольш вядомы як паэт. Яго вершы характарызуюцца высокай інтэлектуальнасцю, неўтаймаваным імкненнем да пазнання сутнасці жыцця. Радкі з паэтычных твораў сталі даўно рамансамі з душэўным лірычным тонам і глыбокім псіхалагізмам. Напрыклад, “Астры” (музыка А. Туранкова): *І марылі астры ў цудоўнаму сне, Аб зёлках шаўковых, аб сонечным дне. І казачны край падымаўся з іх сна, Дзе кветы не вянуць, дзе вечна вясна* [1, т. 1, с. 194]. У сваёй песеннай лірыцы паэт найбольш дасканала спазнаў музыку прыроды праз музыку сэрца, выразна ўзнавіў на новым этапе выключныя вобразна-выяўленчыя мажлівасці песні. Яго рамансы і песні вылучаюцца глыбокім псіхалагізмам, паўнатой светаадчування, душэўнасцю лірычнага гучання (“Душа твая – малюнак артыстычны”, “Ёсць адна толькі мудрасць жыцця”, “Узор прыгожы пекных зор”, “Усё праходзе – і радасць і мукі”, “Я тайну ў глыбіні душы хаваю”, “Хочаш сябе ты пазнаць” і г.д.). Паэта хвалявалі тэмы радзімы, ролі паэта, кахання, душы, хваробы, хуткацечнасці жыцця, развітання. Калі чытаеш радкі “*Пралятайце вы, дні, Залатымі агнямі. Скончу век малады, – аблятайце цвятамі…*”[1, т. 1, с. 319]; “*Я – бальны, бясскрыдлаты паэт! Мо жыцця майго верш ужо спет…*” [1, т. 1, с. 219], міжволі ўспамінаеш радкі Сяргея Ясеніна: *Все мы, все мы в этом мире тленны, Тихо льётся с клёнов листьев медь, Будь же ты вовек благословенно, Что пришло процвесть и умереть* [1, т. 1, с. 194]. Падобны ў нечым лёс маладых паэтаў, такіх таленавітых і такіх трагічных, аб’яднаных любоўю да жыцця, жанчыны, роднага краю, але ж прасякнуты такім драматызмам і прадчуваннем хуткай пагібелі: *маладое жыццё праляціць, прабяжыць, – Не забудзься вясёлых калёраў зажыць* [1, с. 311] / *Скоро мне без листвы холодеть, Звоном звезд насыпая уши, Без меня будут юноши петь, Не меня будут старцы слушать* [3, с. 89]. Вельмі падобна гучыць у паэтаў тэма радзімы: *Край ты мой заброшенный, Край ты мой, пустырь, Сенокос некошенный, Лес да монастырь* [1, с. 125]; *Слухают ракиты посвист ветряной… Край ты мой забытый, Край ты мой родной!* [1, с. 130]; *Сердце гложет плакучая дума… Ой, не весел ты, край мой родной* [3, т. 1, с. 167]. І ў Максіма Багдановіча: *Краю мой родны! Як выкляты Богам – столькі ты зносіш нядолі. Хмары, балоты… Над збожжам убогім вецер гуляе на волі* [1, т. 1, с. 107]; *І снуюцца сумна ў сэрцы, Ўюцца адгалоскі Роднай песні, простай песні Беларускай вёскі…* [1, т. 1, с. 85].

Рускага паэта хвалявалі тэма лёсу вёскі, любоў да бацькоўскай хаты, каханне да жачыны, філасофскія, рэлігійныя пытанні, праз усю паэзію праступае хвалянне за лёс Русі, якая ў яго выступае *деревянная, голубая, ложноклассическая, златая, кроткая, далёкая и близкая, отчалившая, задремавшая, царевна сонная.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Глыбокім трагізмам напоўнена менавіта тэма Русі, драматызм, песімізм, горыч і незразумеласць, адсутнасць адказаў на пытанні, якія ірвалі ягоную душу знутры: *Не в моего ты бога верила, Россия, родина моя! Ты, как колдунья, дали мерила, И был, как пасынок твой, я…* [3, т. 1, с. 200]. І далей паэт з глыбокім надрывам працягвае: *О, будь мне матерью напутною В моем паденьи роковом!* Як трагічна, да болю ў душы, гучаць падобныя радкі і ў наступным вершы: *Устал я жить в родном краю В тоске по гречневым просторам… И вновь вернусь я в отчий дом…* [3, т. 1, с. 193]. Далей паэт апісвае сваю гібель, якая, на вялікі жаль, нічога не зменіць у жыцці яго радзімы: *А месяц будет плыть и плыть, Роняя весла по озерам, И Русь всё также будет жить, Плясать и плакать у забора…* [3, т. 1, с. 194].

Пры такой трагедыйнасці і драматызме вершы паэта вельмі музычныя, многія з іх спяваюцца шматлікімі рускімі спевакамі, рамансы на словы С. Ясеніна вядомыя даўно шырокай аўдыторыі. Шмат вершаў сталі песнямі і рамансамі дзякуючы кампазітару В. Ліпатаву.

Матывы развітання, тугі і безвыходнасці пераплецены ў паэзіі абодвух таленавітых паэтаў: *Сэрца ные, сэрца кроіцца ад болю* [1, т. 1, с. 84]; *Сумна мне, а ў сэрцы смутак ціха запявае* [1, т. 1, с. 81]; *Не умчусь я ў сінюю даль… Ой, чаму жа надзеі і веры Пагасіў у душы я агні?..* [1, т. 1, с. 419]. *Наша вера не погасла, святы песни и псалмы,* – піша С. Ясенін, але ж *не ищи меня ты в боге, Не зови любить и жить… Я пойду по той дороге Буйну голову сложить* [3, т. 1, с. 166].

Такім чынам, творчасць Максіма Багдановіча і Сяргея Ясеніна, напоўненая глыбокім трагізмам, працягвае пакідаць глыбокі, незабыўны, кранаючы душу след у шматлікіх чытачоў і слухачоў іх песень і рамансаў.

## Літаратура


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды / М. Багдановіч – Мн. : Навука і тэхніка, 1993. – 600 с.

2. Лойка, А. А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. / Ч. ІІ. / [Вучэб. дапаможнік для філал. ф-таў ВНУ] / пад рэд. Ю. С. Пшыркова. – Мн. : Выш. школа, 1980. – 440 с.

3. Сергей Есенин. Собрание сочинений в пяти томах. / Стихотворения, поэмы, художественная проза, литературно-критические статьи, автобиографии, письма, шуточные стихи / Есенин Сергей. – М. : Художественная литература, 1966.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова